МІНСКІ ГАРАДСКІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

пр. Незалежнасці, 8, 220030, г. Мінск
Тэл./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/р BY86BLBB36040100621571001001
у Дырэкцыі ААТ «Белінвестбанка»
па г. Мінску і Мінскай вобласці,
БІК BLBBBY2X

МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

пр. Независимости, 8, 220030, г. Минск
Тел./факс (017) 218 00 90, 327 68 66
Р/с BY86BLBB36040100621571001001
в Дирекции ОАО «Белинвестбанка»
по г. Минску и Минской области,
БИК BLBBBY2X

17.08.2018 № 12-22/6494

На № 8/Н ад 07.08.2018

Кансерватыўна-Хрысціянская
Партыя – БНФ
вул.Заходняя, д. 13, пакой 231
220036, г.Мінск

Аб правядзенні мерапрыемства

У Мінскім гарадскім выканаўчым камітэце разгледжана заява Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі – БНФ па пытанні правядзення 25.08.2018 з 12.00 да 14.00 мітынга, прысвечанага 27-й гадавіне надання Дэкларацыі «Аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі» сілы канстытуцыйнага закону, на пляцоўцы ў Кіеўскім скверы з агульнай колькасцю ўдзельнікаў да 1000 чалавек.

Паведамляем вам аб тым, што, згодна з інфармацыяй адміністрацыі Цэнтральнага раёну г.Мінска, на пляцоўцы ў Кіеўскім скверы ў вызначаныя вамі дзень і час запланавана правядзенне іншага масавага мерапрыемства.

Дадаткова інфармуем, што ў адпаведнасці з артыкулам 9 Закону Рэспублікі Беларусь «Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь» забараняецца правядзенне адначасова некалькіх масавых мерапрыемстваў у адным месцы альбо па аднаму маршруту.

Акрамя таго, звяртаем вашу ўвагу на тое, што у Рашэнні Управы Сойму Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі-БНФ ад 06.08.2018 датай правядзення мерапрыемства вызначана 25.08.2016.

Улічваючы вышэйпададзена Мінскі гарвыканкам не дазваляе правядзенне 25.08.2018 з 12.00 да 14.00 мітынга на пляцоўцы ў Кіеўскім скверы.

Намеснік старшыні                                   І.В.Юркевіч

2 Якубоўская 218 01 91